


Надзея ПАРЧУК, г. Брэст

## Начныя гукі

*Хто сказаў, што горад спіць?*
*Горад поўны разнагуку:*
*То машына праімчыць,*
*То цягнік наробіць стуку.*

*А то вецер зашуміць –*
*Залатошыць крыллем шаты,*
*То кажан залапаціць*
*Ці заплача вінавата.*

*То за вокнамі на дол*
*Пераспелы плод сарвецца,*
*Ціша ночы з ясных зор*
*На мае радкі пральецца.*

## Раніца

*Прачнуўся світанак і плюхнуўся ў рэчку*
*Туды, дзе разгойдаўся Мухаўца плёс,*
*А ветрык-свавольнік пранёсся над грэчкай*
*І знік нечакана ў прасторах нябёс.*

*І стала ў паветры зноў ціха і міла,*
*І стала так светла над веснай зямлёй,*
*Што бусел распростаў даўжэзныя крылы*
*І жвава падаўся да рэчкі з зарой.*

*Яшчэ б не адна наша вёска жыла,*
*Не знала б ні згубы, ні страты,*
*Калі б чорным болем бяда не прыйшла,*
*Рассеяўшы цэзій праклятьі.*

*Рассыпаўшы стронцый па роднай зямлі,*
*Атрутай лягла на абшары –*
*І ўсе дасягненні, што мы здабылі,*
*Накрылі смяротныя хмары.*

*Але Беларусь не зламаць у бядзе,*
*Таму зноў і зноў паўтараю:*
*Мацней за народ наш нямае людзей*
*І міласэрней нямае.*

## Не забывай...

*– Ты паглядзі на мноства розных спраў –*
*Вунь, колькі іх паўсюль перад табою.*
*Пакуль што ты шчаслівa падрастаў,*
*Яшчэ не знаўся з горам і бядою.*

*Усё, што бачыш ты вакол сябе, –*
*Тваіх бацькоў і прадзедаў работа.*
*І нават песні добрае запеў*
*Табе, як дар, аддадзены народам.*

*За цішу ўночы і за ясны дзень –*
*Праліта кроў і жыцці адабраны...*
*І для цябе дзядулеў сад цвіце,*
*Палі і нівы бацькам узараны.*

*Не забывай, што прыйдзе час-пара*
*Табе да важных справаў далучыцца:*
*Пра гонар дбаць бацькоўскага двара*
*І бараніць Радзіму навучыцца.*

## ***

*Я не настаўнік, не законнік,*
*Я слова шчырага паэт.*
*Ні эпалеты, ні пагоны*
*Мне не зацьмяць нябесны свет.*

*Мой мілы сябра, мой таварыш*
*І чалавек найдарагі,*
*Не знаю я, аб чым ты марыш,*
*І дзе тых мараў берагі.*

*Але сказаць лічу патрэбным,*
*Ты толькі ў крыўду не прымі:*
*Пакуль жывём пад зводам небным,*
*Нам трэба быць заўжды людзьмі.*

*Хай сейбіт, жнец ты ці араты –*
*Які ўжо лёс табе даў Бог –*
*Будзь чалавекам годным, вартым,*
*Каб след пакінуць добры мог.*